ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
9
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР

№ 13(1534)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Фарміруюцца

пры штабе працоўных спраў універсітэта будаўнічыя брыгады супрацоўнікаў. Месца працы брыгадзе будзе прапанавана абласным штабам СБА. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у сакратара камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў С. Сяргеева (пакой 306, гал. корпус) ці ў штабе працоўных спраў.

В. БОЙКА.

### За «круглым сталом»,

якi адбыўся на геаграфічным факультэце, сустрэліся Мінскі гарадскі савет Беларускага таварыства аховы прыроды, Мінская абласная інспекцыя Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды і савет таварыства аховы прыроды БДУ імя У. І. Леніна. Былі абмеркаваны пытанні ўдасканалення сістэмы грамадскага кантролю за выкананнем патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства.

У рабоце «круглага стала» прынялі ўдзел грамадскія інспектары Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды і студэнцкіх дружын аховы прыроды БДУ, БТІ, іншых ВНУ.

І. КРЫЛОВА.

### Пад пісьмом

у адрас амерыканскага прэзідэнта, якое было зачытана на універсітэцкім мітынгу «Доктару Хайдэру — жыццё!», сабрана 1500 подпісаў. Пісьмо накіравана ў ЗША.

А. САМУЙЛІЧ.

### ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

клуба «Палітыкус» з тэматыкай «Пакістан. Развіццё і праблемы на сучасным этапе» адбудзецца ў кафэ «Гаўдэамус». Усе жадаючыя прыняць у ім удзел запрашаюцца ў кафэ 13 красавіка ў 20.00.

А. САЎЧЫК.

### Падведзены вынікі

ўдзелу інтэрнатаў рэспублікі ва Усесаюзным аглядзе-конкурсе на лепшы рабочы і студэнцкі інтэрнат 1986 года.

За поспехі, дасягнутыя ў паляпшэнні выхаваўчай, культурна-масавай, фізкультурна-аздараўленчай работы сярод рабочых і служачых, студэнтаў і навучэнцаў, пражываючых у інтэрнатах, стварэнні ім найбольш спрыяльных умоў быту і правядзення вольнага часу Ганаровай Граматай ЦК ЛКСМ Беларусі ўзнагароджаны інтэрнат № 6 Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Н. ГУЛЕЙЧЫК.

## фота тыдня



*— ДОЎГА ЧАКАЕЦЕ?*

*Іна Сухарава, студэнтка чацвёртага курса хімічнага факультэта, павіталася:*

*— А ў нас толькі-толькі закончыліся заняткі. Можа, лепш у лабараторыю пройдзем?..*

*Пакуль мы падымаліся на IV паверх, пакуль ішлі па доўгіх калідорах, Іна расказвала пра вучобу, пра прафсаюзную работу, пра жыццё сваей групы. Вучацца ў ёй толькі адны дзяўчаты, па выніках мінулага вучэбнага года яна прызнана лепшай студэнцкай групай універсітэта. Есць у гэтым і пэўная заслуга праформа.*

*Хаця пасля размеркавання заняткі праводзяцца на кожнай кафедры асобна, але і сёння група з'яўляецца адной з лепшых на факультэце.*

*Іна паправіла валасы, даверліва зірнула ў аб'ектыў:*

*— Ну, што, можна фатаграфаваць?*

*НА ЗДЫМКУ: член прафкома універсітэта, праформ адной з лепшых студэнцкіх груп Іна Сухарава.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

## прафсаюзнае жыццё

ВЯЛІКІЯ ЦЕПЛЫЯ ВОЧЫ, СТРЫМАНАЯ ЎСМЕШКА, ЯКАЯ, ЗДАЕЦЦА, РЭДКА ПАКІДАЕ ГЭТЫ ТВАР, НЕЙКАЯ РУХАВАСЦЬ І ЗАКЛАПОЧАНАСЦЬ ВА ЎСЕЙ ПОСТАЦІ — ТАКІМ БЫЛО ПЕРШАЕ ЎРАЖАННЕ АД РЫТЫ АСІНЕНКА, СТАРШЫНІ ПРАФСАЮЗНАГА БЮРО МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. ДА ЯЕ Я ПРЫЙШЛА, КАБ ЗНАЙСЦІ АДКАЗ НА ЗАЦІКАВІЎШЫЯ МЯНЕ ПЫТАННІ.

### НЯМА ДРОБЯЗЕЙ

ЧАМУ ІМЕННА аб прафбюро гэтага факультэта захацелася расказаць? Думаю, адказам прагучаць словы Н. Туромшы, намесніка старшыні прафкома універсітэта па арганізацыйна-масавай рабоце:

— Гэтыя людзі жывуць цікава, іх кожны дзень — у пошуку. Вось невялічкі прыклад. Размясціўся механіка-матэматычны факультэт на IV паверсе галоўнага корпуса. Маленькі буфет, што на першым паверсе ля гардэроба, студэнты мехмата наведваюць не вельмі часта — ім не хапае часу. Неўзабаве прыйшло рашэнне: на вялікім перапынку браць у буфеце некалькі соцень булачак і гандляваць імі на сваім паверсе.

Але, зразумела, не толькі булачкі цікавяць прафбюро мехмата, хаця, згадзіцеся, і гэта не дробязнае пытанне — якая ж вучоба на галодны страўнік?

— Першае, аб чым клапоцімся,— гаворыць Рыта Асіненка,— гэта здароўе студэнтаў. Штомесяц яны маюць магчымасць адпачываць ва універсітэцкім прафілакторыі, ахвотна едуць у санаторыі.

Жывём мы ў інтэрнаце № 7. Наш клопат цяпер — афармленне чытальных залаў. Дробязь, здаецца, але ад яе залежыць у пэўнай ступені паспяховае вывучэнне неабходных дысцыплін.

Не так даўно ў інтэрнаце адбыліся спаборніцтвы паміж паверхамі па настольнаму тэнісу. Добрай традыцыяй, акрамя даўно ўсімі прызнаных «Ану, дзяўчаты», становяцца пасяджэнні клуба «Што? Дзе? Калі?».

Зразумела, жывём мы не без праблем. Кепска пакуль наладжваюцца сувязі са студэнцкім саветам. Ёсць у нас і запаветная мара: хочам зрабіць радыёвузел на трох паверхах, дзе жывуць нашы студэнты. Усё для гэтага, здавалася б, ёсць: і жаданне, і зацікаўленыя ў падрыхтоўцы радыёперадач. Але ёсць і перашкоды: то адміністрацыя не можа выдзеліць памяшканне, то спецыяліста па ўстаноўцы апаратуры не знайсці. Толькі мы ўсё ж спадзяемся, што ў хуткім часе выйдзем у эфір. У сваіх перадачах паспрабуем усебакова ахопліваць пытанні студэнцкага жыцця ў інтэрнаце, будуць у нас і музычныя віншаванні са святамі і днямі нараджэння.

Хвалюе мяне і вось яшчэ што: пасля зімовай сесіі паспяховасць у нас рэзка знізілася, былі такія групы, у якіх сярэдні бал ніжэй за «4». Як гэта растлумачыць? У апошні час патрабаванні з боку выкладчыкаў сталі большымі, а мы яшчэ не гатовы былі да гэтага. За зімовую сесію вырашылі адлічыць з факультэта шасцярых, дэканат падтрымаў нашу прапанову. Каго можа і здзівіць тое, што прафбюро дазваляецца вырашаць такія важныя пытанні, як выдзяленне стыпендыі і выключэнне сістэматычна адстаючых студэнтаў? Але каму ж, як не нам, ведаць, для каго з нашых сакурснікаў 40—50 рублёў адзіная дапамога, а для каго — кішэнныя грошы? Не так даўно сустрэлася з дзяўчынай, якая пасля зімовай сесіі вымушана была пакінуць факультэт. Пытаюся: «Як жывеш?» «Працую,— адказвае.— І ведаеш, вельмі добра, што так, бо веру, у другім годзе ўсе будзе інакш».

Я працую яшчэ толькі першы год. Калектыў у нас, лічу, добры, здаровы, а гэта — самае неабходнае для таго, каб прафбюро працавала якасна. Вось так мы працуем, так жывём.

Запісала Т. ХУДОБА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## прашу слова

### КАБ ІНТАРЭС БЫЎ ІНТАРЭСНЫМ

У АКТАВАЙ зале філфака быў арганізаваны прагляд мастацкага фільма «Тэма». Каб апавясціць студэнтаў, была вывешана аб'ява, зроблена аб'яўленне і для камсоргаў груп. І што ж? Сабралася 15 чалавек, 8 з іх — выкладчыкі. А дзе ж былі іншыя студэнты? Няўжо ўсе яны паспелі паглядзець гэтую вельмі карысную і цікавую стужку?

А хто ведае што-небудзь пра клуб «Дыскусія», які дзейнічае ў інтэрнаце № 7? Цэлы тыдзень віселі аб'явы пра яго пасяджэнне і «Скрыня для пытанняў». За гэты час паступіла ўсяго толькі дзве запіскі. Ніхто больш не пацікавіўся, што гэта за клуб, дзе і калі ён працуе, якія пытанні, праблемы рашаюцца ў яго рамках. «Калі вам цікава, дык і займайцеся ў ім на здароўе. А нам не да гэтага»,— чула такія словы ад рабят, якія выпадкова спыняліся каля аб'явы. А ім да чаго тады ёсць справа?

Мы маем права і павінны спытаць пра гэта ў камітэта камсамола і нашых актывістаў. Хто, як не яны, павінны дапамагаць арыентавацца камсамольцам у важных справах універсітэта, цікавых мерапрыемствах, накіроўваць іх на творчую, актыўную работу.

Для чаго праводзяцца камсамольскія сходы ў групах, на курсах? Жывая, цікавая размова, нават простыя даверлівыя зносіны дапамагаюць зразумець адзін аднаго, убачыць і разабрацца ў прычынах існуючых недахопаў. Але бывае, што камсамольскі сход бяссільны. Што ж гэта за сход, калі на ім прысутнічае палова камсамольцаў? Калі і ўздымаюцца сур'ёзныя пытанні, то ў рэдкіх выпадках яны вырашаюцца да канца. Так, на адным са сходаў III курса беларускага аддзялення ўздымалася пытанне пра адмену куратарства ў групах. Пакрычалі, паспрачаліся. Хто за адмену, хто — супраць, а канкрэтна якое рашэнне было прынята — не зразумела.

Я звяртаюся да нашых актывістаў. Яны ж ёсць, хоць не так ужо іх і многа для нашага факультэта. Як расцэньваюць тую пазіцыю, што займае большая частка нашых камсамольцаў? Цяпер стаіць задача дабіцца ўсеагульнай актыўнасці камсамольцаў. Толькі якім чынам? Цяжкае пытанне. Не зразумела пакуль, чаго ж хочуць нашы камсамольцы, што іх цікавіць? Тое, што прапануе камітэт камсамола, іх не задавальняе. Дык мо не будзем чакаць прапаноў, а прапануем самі?

Л. СЯРГУН,
сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.

